УДК 947.6 (=411.6) «1914/1916»

# НАЦЫЯНАЛЬНА–КУЛЬТУРНАЯ І ДАБРАЧЫННАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ БЕЛАРУСКАГА ТАВАРЫСТВА ДАПАМОГІ ПАЦЯРПЕЛЫМ АД ВАЙНЫ (1915–1917 ГГ.)

***М.В. ЦУБА***
*Палескі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*г. Пінск, Рэспубліка Беларусь*

**Уводзіны.** Першая сусветная вайна карэнным чынам змяніла грамадска–нацыянальнае жыццё на беларускіх землях. У складаных абставінах, падчас увядзення ваеннага становішча, мабілізацыі, бежанства, фактычна ўсялякая дзейнасць беларускага нацыянальнага руху на нейкі момант была значна паралізавана. Патрэбен быў час і новыя магчымасці для таго, каб неяк прыстасавацца да ўмоў вайны з мэтай далейшага працягвання беларускай справы. І такія магчымасці неўзабаве з'явіліся. З'явіліся дзякуючы, у першую чаргу, тым жа цяжкім умовам вайны і пазіцыі самадзяржаўя.

**Асноўная частка.** Забараніўшы дзейнасць грамадска–палітычных згуртаванняў у армейскім тыле, царскі ўрад дазволіў дзейнасць нацыянальных камітэтаў па аказанні дапамогі ахвярам вайны. Так, на Беларусі адкрыліся яўрэйскія, затым польскія камітэты. А з красавіка 1915 г. распачала сваю працу створаная ў Вільні беларуская дабрачынная арганізацыя дапамогі бежанцам пад назвай «Беларускае таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны».


УСТАВЪ
Бѣлорусскаго Общества по оказанію помощи пострадавшимъ отъ войны.
СТАТУТ
Беларускаго Таварыства па аказаньню помачы пацярпеушым ад вайны.

**Статут Беларускага таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны. 1915 г.**

З дакументальных даведак гэтага таварыства вынікае, што «яно аб'яднала вакол сябе ўсе палітычныя групы беларусаў, аб'яднала палітыкаў і праваслаўных і стала агульнанацыянальнай арганізацыяй» [1, арк.11]. Старшынёй таварыства былі абраны Вацлаў Іваноўскі, акрамя яго ў адміністрацыю ўвайшлі А. Луцкевіч, В. Ластоўскі, П. Аляксюк, І. Біндзюк, У. Сталыгва, С. Савіцкі, Н. Клім і І. Буйніцкі [2, арк.1].



**Старшыня Беларускага таварыства пацярпелым ад вайны. Вацлаў Іваноўскі**



**Ігнат Буйніцкі**

Фактычна ўся арганізацыя складалася з актыўных дзеячаў беларускага нацыянальнага руху. Але напачатку сваёй дзейнасці ў новай ролі яны яшчэ не вызначаліся шырокім ахопам задач, якія б спалучалі дабрачынную працу з беларускай нацыянальнай, і ў асноўным займаліся выкананнем сваіх непасрэдных абавязкаў. Аб гэтым сведчыць і адзін са зваротаў таварыства да грамадзянскага насельніцтва: «Няхай усе свядомыя беларусы і ўсе праўдзівыя грамадзяне Беларускага краю без розніцы веры і нацыі адклікнуцца на гэты наш кліч... няхай памогуць сваёй працай і грашмі, каб споўніць свой грамадзянскі абавязак перад Родным краем, споўніць вялікі запавет любві да чалавека!» [2, арк.2]. Для рэалізацыі дабрачынных мэт у Вільні члены таварыства пачалі выдаваць аднаднёўкі, якія заклікалі аказваць дапамогу ахвярам вайны [3, с.277]. Акрамя таго, таварыства выкарыстоўвала для змяшчэння сваёй інфармацыі і газету «Беларус».



BIEŁARUS

**Газета «Беларус» выкарыстоўвалася Беларускім таварыствам дапамогі пацярпелым ад вайны для змяшчэння інфармацыі**



Пагалелым ад вайны Беларусам памажыця!

Вайна нарабіла страты і крыуды вялікай палавіне Беларусі. Ад Пінску да Дзьвінску ідуць акопы разоры на зямельца Беларускай. А скрось калягэных акопау, абапал іх, стырчма стаяць разбітыя будынкі селянскія, або агнёмъ знішчаныя сёлы — вуглём ды попілам у вочы бйуцца ды сьлёзы наверх націскаюць. Гаспадары разбегліся па сьвету і тамъ адны у бядзе ды у нудзе на сьмерць нарваліся ды у чужую зямельку із касьцьмі, із целам на векі залягли, а другія якнебудзь з жыцьцём барукаюцца, алі шмат бяды зносюць, бо цяжэнька у цяперашнюю дарагоулю жыць. І хтож ім паможыць? Сваеж людцы найперш павінны ім памагчы.

Ось 24 і 25 чэрвіня (Іюня)

будзіць збор грошы і адзежы па усім Пітраградзе давайця добрыя людцы сколькі Ваша змога хто зборшчыкам, а хто проста у КАМІТЭТ БЕЛАРУСКАГА ТАВАРЫСТВА для помачы пацярпеушым ад вайны на Знаменскай вуліцы у д. № 38, кв. 54 (тэлеф. 253 49) штодзень ад 11 да 9 гадзіны веч.

Проша шчыра дапамагчы бядзе пацярпеушым Беларусам!

За шчырую падмогу будзіць шчыры дзякуй.

**Лістоўка, выдадзеная Беларускім таварыствам у Петраградзе па аказанні дапамогі пацярпелым ад вайны. 1916 г**

ПолесГУ

У адным з артыкулаў газеты аўтар расказваў пра цяжкі лёс бежанцаў, заклікаў да матэрыяльнай іх падтрымкі і ўважлівых адносінаў, якія хоць часова дапамаглі б ім пазбавіцца голаду, жабрацтва і жахаў вайны [4, с.1]. Галоўным зместам работы таварыства з’ўлялася арганізацыя пунктаў харчавання, адкрыцця сталовых, інтэрнатаў, дзіцячых дамоў і аказанне медыцынскай дапамогі бежанцам. Сродкі на выкананне дабрачынных спраў складаліся з членскіх узносаў, ахвяраванняў, а таксама з культурна–дабрачынных мерапрыемстваў. Спробы Беларускага таварыства па прыкладу іншых дабрачынных арганізацый атрымаць субсідыі ад Земгора і Таццянінскага камітэта поспеху не мелі «з–за вельмі абмежаваных фінансавых рэсурсаў» гэтых арганізацый [5, арк.85,86]. Але нягледзячы на гэта, віленскае таварыства паступова пашырала свой уплыў на іншыя беларускія рэгіёны. Так, спачатку яно накіравала сваіх упаўнаважаных у Гродзенскую (П.Аляксюк) і Віленскую (В.Ластоўскі) губерні. Затым у чэрвені–ліпені 1915г. адкрыла аддзелы сваёй арганізацыі ў Мінску, Дзісне, Вілейцы, Празароках, Друскеніках, в. Гожа Гродзенскай губерні, Полацку, якія мелі права весці работу незалежна ад таварыства ў Вільні [6, с.359]. Найбольшай актыўнасцю сярод іх вылучаўся Мінскі аддзел Беларускага таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны (кіраўнік Р. Скірмунт), які вялікую ўвагу надаваў адкрыццю ў Мінску і ў гарадах Мінскай губерні бясплатных дашкольных устаноў.



**Галосны прадстаўнік Мінскай губернскай земскай управы, кіраўнік Мінскага аддзела «Беларускага таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны» Раман Скірмунт**



**Вацлаў Ластоўскі**

ПолесГУ

Напрыклад, 11 верасня 1915г. ён адкрыў у Мінску прытулак для школьнікаў N6 і наладзіў навучанне на роднай мове. Акрамя таго, тут былі адкрыты дзве дабрачынныя ўстановы для дзяцей дашкольнага ўзросту: дзіцячы прытулак і сірочы дом (май 1915г.). Адчыняліся прытулкі таксама і ў іншых гарадах Беларусі ў асноўным для асірацелых дзяцей бежанцаў. Усе яны ўтрымліваліся на сродкі аддзела таварыства і за кошт добраахвотных ахвяраванняў [7, арк.94].

Аднак паступова дзейнасць усіх аддзелаў Беларускага таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны пачала ўсё больш набываць палітычную афарбоўку. Менавіта гэтаму ў значнай ступені садзейнічалі былыя дзеячы БСГ, якія ўваходзілі ў таварыства і адначасова падтрымлівалі пэўныя сувязі з іншымі арганізацыямі сацыялістычнай арыентацыі, аб чым сведчыць той факт, што «на міжпартыйным сходзе Беларускай Сацыялістычнай Грамады, Бунда і Польскай партыі сацыялістаў летам 1915 года была дасягнута дамоўленасць прадстаунікоў гэтых партый аб узаемнай інфармацыі і ўзгадненні іх дзейнасці» [8, с.85].



**Дом па вуліцы Віленская, 33, дзе знаходзілася Беларускае таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны**

Напярэдадні акупацыі Вільні нямецкімі войскамі (верасень 1915г.) частка кіраўнікоў Беларускага таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны (В. Іваноўскі, П. Аляксюк і інш.), а таксама многія вядомыя прадстаўнікі беларускага нацыянальнага руху эвакуіраваліся на Усход, туды, дзе знаходзіліся тысячы бежанцаў з беларускіх губерняў. У час бежанства беларускія нацыянальна–дэмакратычныя дзеячы, падобна прадстаўнікам іншых нацыянальнасцей, імкнуліся да стварэння бежанскіх арганізацый і камітэтаў, якія б аказвалі бежанцам–беларусам дапамогу ва ўладкаванні на новых месцах і патрабавалі б з агульнага фонду дабрачынных арганізацый неабходныя сродкі і рэчы. Аднак асабліва на пачатку гэтай работы беларускія дзеячы сутыкнуліся з пэўнымі цяжкасцямі непаразумення і недаверу з боку ўладаў. Амаль усюды расійскі ўрад ставіў беларускай дабрачыннай справе пастаянныя перашкоды: не выдзяляў неабходных для жыцця сродкаў, перадаваў усе клопаты па ўладкаванні ў чужыя чыноўніцкія рукі, усюды абмяжоўваў доступ інтэлігенцыі да свайго народа. Галоўным аргументам, якім урад апраўдваў свае дзеянні, была спасылка на тое, што беларусы нічым не адрозніваюцца ад жыхароў мясцовых губерняў, а таму могуць без лішніх патрэб і арганізацый ужыцца з мясцовым насельніцтвам. Менавіта адсутнасцю на многіх месцах рассялення беларускіх нацыянальных арганізацый дапамогі бежанцам і тлумачыцца той сумны факт, што становішча бежанцаў–беларусаў у Расійскай імперыі заставалася найбольш цяжкім [9, с.6].

Што датычыцца самога Беларускага таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны, то пасля эвакуацыі з Вільні старшыні Вацлава Іваноўскага яно працягвала сваю дзейнасць ва ўмовах нямецкай акупацыі пад кіраўніцтвам Антона Луцкевіча. Восенню 1915 г. гэтая арганізацыя згуртавала вакол сябе даволі значную групу дзеячаў беларускага нацыянальнага руху. Сярод якіх найбольшую ролю адыгрывалі Ф. Аляхновіч, А. Пашкевіч–Кайрыс, В. Ластоўскі, І. і А. Луцкевічы, В.Святаполк–Мірскі, Я.Салавей, Ю. і Л.Мэнке, Б.Пачопка, А.Рачкоўская, Ф.Вішнеўскі, Я. Ліцкевіч, У. Талочка, Ч. Родзевіч. [10, с.16].

ПолесГУ



**Антон Луцкевіч**



**Іван Луцкевіч**

Разам з аказаннем маральнай і матэрыяльнай дапамогі ахвярам вайны арганізацыя з цягам часу ўсё больш займалася грамадска–палітычнымі справамі. Яна выконвала абавязкі прадстаўніка нацыянальных інтарэсаў беларускага насельніцтва перад акупацыйнымі ўладамі, актыўна праводзіла культурна–грамадскую дзейнасць у нацыянальным духу, спалучаючы яе з дабрачыннымі мерапрыемствамі, выкрывала палітыку некаторых польскіх арганізацый і духавенства, накіраваную на апалячванне беларусаў–католікаў, выступала супраць польскіх замахаў на беларускія землі, за рэарганізацыю польскага касцёла і інш. Напрыклад, у адным з дакументаў, дасланых кіраўніцтвам гэтага таварыства да нямецкіх акупацыйных улад, выказваецца патрабаванне: «...рэарганізаваць у Краі вышэйшае ўпраўленне каталіцка–клерыкальных касцёлаў – шляхам увядзення ў яго прадстаўнікоў не толькі палякаў, але і беларусаў і літоўцаў, для таго каб беларускі народ атрымаў магчымасць слухаць божае слова на сваёй роднай мове і каб клір перастаў служыць сродкам польскай прапаганды» [11, арк.18]. Выконваючы абавязкі прадстаўніка нацыянальных інтарэсаў беларускага народа перад акупацыйнымі уладамі, дадзеная арганізацыя імкнулася ажыццявіць больш значныя планы. З аднаго боку, яна дабівалася большага даверу і паўнамоцтваў для сваёй дзейнасці ад германскіх ваенных улад. Як перспектыву на будучае, некаторыя дзеячы таварыства прапанавалі акупацыйнаму кіраўніцтву Вільні наступнае: «Беларусы павінны тут атрымаць магчымасць для стварэння моцнага культурна–нацыянальнага ачага, які аказваў бы ўплыў на частку Беларусі, застаўшуюся пад уладай Расіі і даваў бы падтрымку замежным брацціям, якія праследуюцца расейскімі ўладамі» [11, арк.17].

Акрамя гэтых праблем, важным накірункам дзейнасці беларускага таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны з’яўлялася культурна–асветніцкая праца сярод дарослых і дзяцей. Для арганізацыі і пашырэння сеткі беларускіх школ пры ім была створана школьная камісія, у якую ўваходзілі А. і І.Луцкевічы, Б. Пачопка, Цётка, Кастравіцкая і інш.

Патрэбна асабліва адзначыць, што адраджэнне беларускай школьнай справы ў заходніх губернях Беларусі пачалося нават раней загада Гіндэнбурга. Фактычна першая беларуская пачатковая школа была адкрыта ў Вільні 13 лістапада 1915 г., а да канца года іх было ўжо некалькі. Ва ўсякім выпадку, у лісце Антона Луцкевіча, дасланым у Віленскі мясцовы Магістрат ад 17 снежня 1915 г., напісана наступнае: «Пасылаю ... спіс беларускіх школ – як ужо адкрытых, так і тых, каторые канечне павінны быць адкрыты ў найбліжэйшы час, каб хоць больш–меньш здаволіць патрэбу беларускага насельніцтва места Вільні асвойваць пачатковую навуку на роднай матчынай мове». Далей з ліста вынікае, што ў горадзе пры Магістраце існавала мясцовая камісія народнай асветы. Менавіта ў гэтую камісію А.Луцкевіч прапаноўваў Магістрату «...увесці прадстаўнікоў беларускага грамадзянства – побач з прадстаўнікамі ўсіх нацый, якія маюць у горадзе свае школы» [12, арк.9].

Ёсць вельмі розныя дадзеныя адносна колькасці адчыненых пачатковых школ у 1916 годзе. Язэп Лёсік пісаў: «Навучэнне вялося на беларускай мове. Апрача звычайных навукаў, выкладалася беларуская мова, гісторыя Беларусі і беларускага пісьменства. У весну 1916 року ў Вільні было ўжо 5 школак. Меліся яшчэ залажыць каля 10... Ёсць ведамасці, што беларускія школкі былі заложаны і ў другіх месцах» [13, с.145]. Аднак адраджэнне беларускага школьніцтва і павелічэнне колькасці пачатковых школ сутыкалася з праблемамі недахопу настаўнікаў (адны эвакуіраваліся, другія былі мабілізаваны ў расійскую армію), а таксама нястачай беларускіх школьных падручнікаў. Частка ж настаўнікаў патрабавала перападрыхтоўкі, і для іх былі адкрыты яшчэ ў лістападзе 1915 г. у Вільні настаўніцкія курсы, дзякуючы клопатам Івана Луцкевіча і Цёткі. На гэтых курсах бясплатна выкладалі браты І. і А. Луцкевічы, Ю. Вітан–Дубяйкаўская і інш. З–за недахопу часу не магла тут займацца выкладчыцкай працай Цётка, але яна «выказвала сваё задавальненне тым, што з дапамогай выпускнікоў трохмесячных курсаў можна будзе адкрываць беларускія школы на ўсіх ускраінах Вільні, дзе жыло шмат беларусаў» [14, с.50].

Неўзабаве па хадатайніцтву Беларускага таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны было прынята рашэнне і аб адкрыцці беларускай настаўніцкай семінарыі ў Свіслачы Ваўкавыскага павета, што на Гродзеншчыне. Цяжка аказалася знайсці выкладчыкаў, таму заняткі пачаліся са спазненнем. Аб адкрыцці беларускай семінарыі ў Свіслачы паведамляў «Гоман»: «17 кастрычніка 1916 года адкрыты беларускія настаўніцкія курсы. Пасля кароткай прамовы кіраўніка школьных спраў, які адзначыў вагу курсаў, былі агледжаны ўсе памяшканні, практычнае устройства каторых задаволіла ўсіх. Дырэктарам семінарыі быў анямечаны сілезец Бэндзеха, а выкладчыкамі Пачопка, Квяцінскі, Вернікоўскі, часова прафесар Рудольф Абіхт з Вроцлаўскага Універсітэта. Акрамя таго, у семінарыі вялі заняткі вядомыя беларускія дзеячы, так А.Луцкевіч выкладаў беларускую граматыку, І.Луцкевіч – геаграфію і краязнаўства, В.Ластоўскі – гісторыю, Цётка – педагогіку, Ю.Мэнке – нямецкую мову, М.Клімант – спевы, С.Іваноўская – гімнастыку, Я.Булгак – гігіену і іншыя.



**Алаіза Пашкевіч–Кайрыс (Цётка)**



**Юліяна і Ляля Мэнке**

У выніку тут атрымалі падрыхтоўку 144 настаўнікі беларускіх школ. Роля, якая адводзілася ў беларускім нацыянальным руху настаўніцтву, добра выкладзена «Гоманам» у звароце да беларускіх настаўнікаў. У ім адзначаецца, што «па ўсёй зямлі беларускай з гэтага боку фронту загараюцца аганькі самабытнай нацыянальнай працы, і праца гэта даходзіць да самай глыбіні народных мас. Такімі вогнішчамі нацыянальнага духу з’яўляюцца беларускія народныя настаўнікі... народны настаўнік павінен памятаць, што на ім ляжыць важная задача не толькі

навучыць дзяцей чытаць, пісаць, рашаць карыстаючыся роднай мовай, але і выхаваць іх на добрых грамадзян краю, сапраўдных сыноў свайго народу» [15, с.2].

Хацелася б адзначыць, што нягледзячы на цяжкасці ваеннага часу, рэжым акупацыі, недахоп вучэбнага абсталявання, роля беларускіх школ і асабліва Свіслацкай настаўніцкай семінарыі, як цэнтра распаўсюджвання роднай мовы, культуры і беларускай думкі, была вельмі істотнай, а свядомасць насельніцтва Свіслачы і навакольных вёсак – высокай. Аб гэтым сведчыць патрабаванне жыхарамі дадзенай мясцовасці адкрыцця пазней, у 1921 годзе, школы з беларускай мовай навучання ў Свіслачы, калі тут усталявалася польская ўлада [16, с.16].

Горш выглядала справа з беларускімі школьнымі падручнікамі. Да 1915 г. для прыватных нелегальных школ і хатняй адукацыі беларускае выдавецтва ў Пецярбургу на чале з Б.Эпімах–Шыпілам «Загляне сонца і ў наша аконца» выдала 3 падручнікі ў 5–ці кніжках. Акрамя гэтага, выкладчыкам беларускай мовы Свіслацкай семінарыі Баляславам Пачопкай былі выдадзены «Беларускі малітоўнік» (Вільня –1915г.) і «Святы Езафат Кунцэвіч» (Вільня 1916 г). Як падручнікам для пачатковых і сярэдніх школ часова карысталіся «Кароткай гісторыяй Беларусі» – (Вільня 1910г) Власта (В.Ластоўскага), а таксама складзенымі і выдадзенымі ім «кніжыцай для школьнага чытання» («Родныя зярняты» – 1915 г.) і «першай пасля лемантара чытанкай» («Незабудка» – 1916 г.) [17, с.102].

Безумоўна, гэтых падручнікаў было недастаткова для ўсё ўзрастаючай колькасці легальных беларускіх школ у Заходняй Беларусі. Таму беларускі народны камітэт у Вільні ў канцы 1915 г. заснаваў сваё выдавецтва, а з прыватных ахвяраванняў стварыў фінансавы фонд і арганізаваў друкаванне новых школьных падручнікаў першай неабходнасці.

Навучанне было бясплатным, бедных вучняў таварыства забяспечвала адзеннем і харчаваннем. Акрамя таго, школьная камісія распрацоўвала навучальныя праграмы, прызначала настаўнікаў, наладжвала падрыхтоўку і выданне падручнікаў, разглядала пытанні беларускай навуковай тэрміналогіі.

У канцы 1916–га – пачатаку 1917г. значныя змены у беларускай справе адбыліся і ва ўсходняй частцы Беларусі, якая ўваходзіла ў сферу дзейнасці расійскіх войск. У гэты час у вялікіх і малых гарадах і мястэчках на неакупіраванай частцы Беларусі пачынаюць дзейнічаць самыя розныя нацыянальныя па форме арганізацыі, як дабрачынныя, так і культурна–асветніцкія. Прыкладам у справе нацыянальнай дзейнасці ў гэты перыяд з'яўляецца Мінск, у якім маладая беларуская інтэлігенцыя аб'ядноўвалася ў таварыствы, клубы, гурткі, каб паспрабаваць заявіць аб сабе, сваіх намерах, здольнасцях, задумах і планах. Асноўнымі цэнтрамі такіх аб'яднанняў інтэлігенцыі і моладзі тады былі «беларускія хаткі» [18, с.10]. Як правіла, па суботах у іх адбываліся доўгія і змястоўныя вечарыны, на якіх абмяркоўваліся палітычныя пытанні, разбіраліся і асэнсоўваліся беларускія нацыянальныя справы. Часта арганізоўваліся спектаклі і іншыя культурна–асветніцкія мерапрыемствы, а набытыя сродкі ў іх ішлі на дабрачыннасць.

У Мінску адным з такіх пунктаў, які аб'ядноўваў беларускіх пісьменнікаў, паэтаў, мастакоў, публіцыстаў і іншых культурных дзеячаў, з'яўлялася «беларуская хатка», створаная па ініцыятыве Мінскага аддзела «Беларускага таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны». Яна размяшчалася ў сталовай гэтага таварыства ў доме пад нумарам 18 па Захараўскай вуліцы каля Чырвонага касцела [19, с.133]. У яе рабоце таксама, як і ў працы таварыства, прымалі актыўны ўдзел буйны беларускі землеўласнік Раман Скірмунт, прадстаўніца старога беларускага роду княгіня Магдалена Радзівіл, ксёндз Вінцэнт Гадлеўскі, тэатральныя дзеячы Уладзіслау Галубок, Усевалад Фальскі, вучоны Аркадзь Смоліч, архітэктар Лявон Дубяйкоўскі, літаратары – Ядвігін Ш.(Антон Лявіцкі), Змітрок Бядуля, Арнольд Паўловіч, Язэп Фарботка, Рамуальд Зямкевіч, а таксама пазней вядомыя дзеячы беларускага нацыянальнага руху – Язэп Лесік, Фабіян Шантыр, Зоська Верас, Людвіка Сівіцкая, Ванда Лявіцкая і іншыя [20, с.149].

Полесгу



**Аркадзь Смоліч**



**Язэп Лёсік**

У шматлікіх культурна–асветніцкіх мерапрыемствах, якія рыхтавала і праводзіла «Беларуская хатка», былі адлюстраваны сацыяльна–вострыя і актуальныя праблемы грамадскага і палітычнага жыцця беларускага народа. У «Беларускай хатцы» былі пастаўлены п’есы Я. Купалы, К. Каганца, інсцыніравана паэма «Тарас на Парнасе» і інш. Усё гэта садзейнічала распаўсюджванню прагрэсіўных настрояў сярод шырокіх слаёў насельніцтва, узмацняла працэс кансалідацыі рэвалюцыйна–дэмакратычных сіл у беларускім нацыянальна–вызваленчым руху» [21, с.47].

Такім чынам, як у рабоце «хаткі», так і ў цэлым Мінскага аддзела «Беларускага таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны» галоўную ролю адыгрывалі прадстаўнікі дэмакратычнай беларускай інтэлігенцыі. Менавіта пад іх уплывам дадзенае таварыства арганізоўвала і праводзіла асветніцкія і дабрачынныя мерапрыемствы, мерапрыемствы ў абарону беларускай культуры, збіраліся сродкі для аказання дапамогі параненым, бежанцам, салдацкім сем’ям.

Актыўны удзел у працы Мінскага аддзела таварыства прымаў Максім Багдановіч. У Мінскай губерні знаходзілася вялікая колькасць бежанцаў. Многія жылі пад адкрытым небам. Паэт, сам будучы смяротна хворым, не шкадаваў сіл, каб аблегчыць лёс гэтых людзей. Ён друкаваў артыкулы ў часопісе «Украинская жизнь», якія расказвалі аб цяжкасцях бежанцаў, дзейнасці таварыства, аб дзіцячым прытулку, што знаходзіўся ў Ратамцы пад Мінскам [20, с. 133–134]. На працягу некалькіх месяцаў М. Багдановіч рэгулярна прыходзіў у «Беларускую хатку», сустракаўся з яе наведвальнікамі. Ён нікога не вучыў, як жыць і што рабіць. Сама справа жыцця Багдановіча станавілася для інтэлігенцыі і маладых людзей Мінска ўзорам і прыкладам служэння Айчыне, вернасці абранаму шляху.



**Максім Багдановіч у Мінску.**
**Рэпрадукцыя работы мастака І. Пратасені**

Полесгу

«Ніхто не чытаў нам лекцыяў, не пераконваў, не агітаваў, – напісана ў артыкуле Апалоніі Савенак «Калісьці ў Менску». – Гэтыя выдатныя людзі выбралі найвастрэйшую зброю – мастацкае слова. Яны прамаўлялі да нас вуснамі нашых паэтаў–адраджэнцаў. Калі Смоліч дэклямаваў Купалава «Над Нёманам» або Гарунова «Ты, мой брат, каго звацъ беларусам...», калі Галубок дэклямаваў гарачыя Купалавы поклічы, калі Лявіцкая дэклямавала цёплыя Цётчыны ды Буйлянчыны творы – тут была й любасць да пакрыўджанае Бацькаўшчыны, і слаўная мінуўшчына яе, і пашана да свае мовы. Гэта было для нас і навукай, і клічам, і загадам, і праграмай дзейнасці. Мы бачылі ідэю, тую высокую, велічную ідэю змагання за волю свае Бацькаўшчыны й свайго народу...» [18, с.12].

**Заключэнне.** Створанае Беларускае таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны аб'яднала намаганні многіх вядомых беларускіх грамадскіх дзеячаў розных поглядаў і веравызнанняў. Яно выконвала не толькі дабрачынную функцыю, але і было легальнай формай працы беларускай нацыянальнай інтэлігенцыі, накіраванай на адраджэнне самасвядомасці беларусаў. Так, цяжкасці ваеннага часу не толькі не прывялі да значнага паслаблення грамадскай справы беларускага нацыянальнага руху, але і загартоўвалі, вучылі ягоных прадстаўнікоў па–новаму арганізоўваць, і спалучаць у адзіным цэлым дабрачынную і культурна–нацыянальную працу.

## ЛИТАРАТУРА


1. Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва (БДАМЛіМ). Фонд 3. – Воп. 1. – С.131.
2. БДАМЛіМ. Фонд 3.– Воп.1. – С.101.
3. Багдановіч, М. Поўны збор твораў : у 3т. Т.2 : Мастацкая проза, пераклады, літаратурныя артыкулы, рэцэнзіі і нататкі, чарнавыя накіды / М. Багдановіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 600с.
4. Да грамадзян Беларусі! // Беларус. – 1915. – 4 чэрвеня.
5. Национальный архив Республики Беларусь (НАРБ). Фонд 295. – Воп.1. – С.8982.
6. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6т. Т.1. Назв. Праца.
7. НАРБ. Фонд 295. – Воп.1. – С. 8982.
8. Бугаев, Е. Возникновение большевистских организаций и образование Компартии Белоруссии / Е. Бугаев. – М.: Госполитизда, 1959. – 270с.
9. Цвикевич, А. Краткий очерк возникновения Белорусской Народной Республики / А. Цвикевич. – Киев: Тип. И.И.Чоколов, 1918 – 16с.
10. Туронак, Ю. Беларусь пад нямецкай акупацыяй. Назв. Праца / Ю. Туронак.
11. БДАМЛіМ. Фонд 3. – Воп. 1. – С. 131.
12. БДАМЛіМ. Фонд 3. – Воп.1. – С. 126
13. Лёсік, Я. Творы : Апавяданні. Казкі. Артыкулы / Я. Лёсік – Мінск : Маст.літ., 1994.–335 с.
14. Снапкоўская, С.В. Ля вытокаў нацыянальнай педагогікі: З гісторыі школы і педагагічнай думкі Беларусі канца XIX – пачатку XX ст. / С.В. Снапкоўская. – Мінск : Нар. Асвета, 1995. –128 с.
15. Адкрыццё беларускай семінарыі // Гоман. – 1916. – 3 лістапада.
16. Палубінскі, А. Лунаў дух вальнадумства /А. Палубінскі // Літаратура і мастацтва. – 1993. – 13 жніуня.
17. Вяртання маўклівая споведзь : постаці творцаў беларускай гісторыі ў кантэксце часу. – Мінск : Выш. Шк., 1994. – 318 с
18. Мяснікоў, А. Нацдэмы : лёс і трагедыя Фабіяна Шантыра, Усевалада Ігнатоўскага і Язэпа Лёсіка / А. Мяснікоў ; прадмова Б. Сачанкі. – Мінск : Беларусь, 1993. – 110с.
19. Памятники Минска /Авт.–сост. В.П.Шамов. – Минск : Полымя, 1991 – 208с.
20. Скалабан, В. В это суровое и важное время: Максим Богданович в Минске / В. Скалабан // Нёман. – 1981, N12. – с.148–152.
21. Сташкевич, Н.С. Приговор революции: Крушение антисоветского движения в Белоруссии (1917–1925) / Н.С. Сташкевич. – Минск : Университетское, 1985. – 304с.


Полесгу

## NATIONAL, CULTURAL AND CHARITABLE ACTIVITIES OF THE BELARUSIAN ASSOCIATION OF ASSISTANCE TO THE VICTIMS OF WAR (1915–1917)

***M.V. TSUBA***

***Summary***

Various aspects of national, cultural and charitable activities of the Belarusian association of assistance to the victims of war are researched in this article.

Special attention is paid to the conditions which took place during the First World War on the Belarusian lands and greatly influenced the work of the departments of this charitable organization.

© Цуба М.В.

*Поступила в редакцию 15 октября 2012г.*

ПолесГУ